


# ЯК ПАЛЕПШЫЦЬ ВОНКАВЫ ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ?

Policy paper удзельнікаў Кейс-клубу ЦНІ | Травень 2023

Беларусь – незнаёмая краіна для пераважнай большасці замежнікаў. Чым далей на Захад ад нашай краіны, тым меней мясцовыя жыхары ведаюць пра Беларусь. А калі і маюць нейкія веды, то часта памылковыя. Пра Беларусь часцей за ўсё пішуць як пра васала Расеі, а не як пра самастойную дзяржаву. З пачаткам поўнамаштабнай вайны Расеі супраць Украіны дамінавальным актарам, які фармуе імідж Беларусі за мяжой, стаў Аляксандр Лукашэнка. У гэтым кантэксце пазіцыя Офіса Святланы Ціханоўскай і іншых дэмакратычных сілаў у медыйнай прасторы стала менш заўважнай.

Дэмакратычным сілам, грамадскасці, журналістам і іншым зацікаўленым стэйкхолдарам варта ўкладаць сродкі ў паляпшэнне вонкавага вобразу Беларусі. Пазітыўны імідж беларускага грамадства дапаможа ў будучыні ўплываць на партнёрскія сувязі з іншымі краінамі, наладжваць сацыяльны і культурніцкі абмен, аднаўляць інвестыцыйны клімат і пазбаўляцца ад стэрэатыпаў пра беларусаў за мяжой.

Акрамя таго, пашырэнне ведаў пра Беларусь непасрэдна выгаднае вонкавым актарам. Краіны ЕС, асабліва суседзі Беларусі, зацікаўленыя ў стабільнасці ў рэгіёне. Эканамічная стабільнасць, новы рынак, прадказальныя адносіны і гандлёвыя шляхі гарантуюць магчымасці эканамічнага росту асабліва для меншых па тэрыторыі краін-суседак Беларусі як Літва і Латвія. Бяспека ў рэгіёне дапаможа зменшыць выдаткі на войска, ахову мяжы і дазволіць перанакіраваць гэтыя сродкі на іншыя сферы. Гэта немагчыма, пакуль рэжым Лукашэнкі каапэруецца з Расеяй, якая распачынае войны і пагражае свету выкарыстаннем ядравай зброі. Лукашэнка стварыў міграцыйны крызіс на мяжы з Еўрасаюзам і не можа гарантаваць бяспеку ў паветранай прасторы Беларусі.

## ШТО ЗАМЕЖНІКІ ВЕДАЮЦЬ ПРА БЕЛАРУСЬ?

**White Russia.** З дапамогай сэрвісу SemRush[1] мы параўналі колькасць пошукавых запытаў у Google слова “Belarus” і назваў краін-суседак альбо дзяржаваў з падобнай колькасцю насельніцтва (Польшча, Расея, Эстонія, Літва, Латвія, Украіна, Чэхія, Венгрыя, Швецыя). У глабальных запытах Беларусь абганяюць толькі Украіна, Расея і Польшча, але пры гэтым пра Беларусь маецца найменшая колькасць публікацый.

Найбольш папулярныя запыты пра Беларусь тычацца пытання аб тым, дзе знаходзіцца краіна. Падобныя запыты часта робяць і пра Літву, Латвію, Чэхію ды Эстонію. Пры гэтым запыт пра тое, ці з’яўляецца краіна часткай Расеі, сустракаецца толькі ў сувязі з Беларуссю. У некаторых краінах грамадзяне часцей цікавяцца, як правільна называць нашу краіну: (прыклад такіх запытаў: *“why is belarus called white russia”*, *“warum heißt weißrussland jetzt belarus”*). Таксама часта сустракаюцца пытанні пра дыктатуру, прычыны дапамогі Расеі альбо пра патэнцыйную анексію Расеяй.

1 Semrush – гэта платформа, якая дазваляе ацэньваць ключавыя словы ў пошуку паводле аб’ёмаў выдачы ў канкрэтным рэгіёне, папулярнасці ў дынаміцы, даваць ацэнку канкурэнцыі на падставе абранага ключавога слова і г.д.

Bulk Keyword Analysis 10

Add to keyword list | Update metrics 1/250 | Export

| Keyword | Intent | Volume | Trend | KD % | CPC (USD) | Com. | SERP Features | Results | Updated |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ukraine | I T | 9,140,000 | | 100 | 2.66 | 0.00 | ? +3 | 2.8B | Last week |
| Russia | I | 2,740,000 | | 100 | 1.64 | 0.00 | +3 | 2.5B | Last week |
| Poland | I T | 550,000 | | 94 | 1.92 | 0.00 | +4 | 1.7B | Last week |
| Belarus | I | 368,000 | | 87 | 0.00 | 0.00 | +2 | 962.0M | Last week |
| Sweden | I | 246,000 | | 97 | 1.19 | 0.00 | +2 | 1.8B | Last week |
| Estonia | I | 165,000 | | 87 | 2.50 | 0.00 | +2 | 1.5B | Last week |
| Hungary | I | 165,000 | | 88 | 2.73 | 0.00 | +2 | 1.6B | Last week |
| Lithuania | I | 165,000 | | 90 | 2.69 | 0.00 | +3 | 1.2B | Last week |
| Latvia | I | 135,000 | | 86 | 1.88 | 0.00 | +2 | 1.1B | Last week |
| Czech | I | 27,100 | | 79 | 1.19 | 0.00 | +3 | 1.9B | Last week |

**Таб. 1. Колькасць пошукавых запытаў з назвамі краін (Belarus, Poland, Russia, Estonia, Lithuania, Latvia, Ukraine,Czech, Hungary, Sweden) на сайце SemRush.**

By number | By volume

| All keywords | 43,596 |
|---|---|
| russian | 2,067 |
| vs | 1,289 |
| minsk | 1,287 |
| visa | 1,255 |
| tractor | 1,080 |
| ukraine | 993 |
| map | 654 |
| league | 616 |
| poland | 615 |
| embassy | 490 |
| country | 480 |
| live | 431 |
| national | 429 |
| border | 374 |
| state | 363 |
| hetalia | 355 |
| news | 354 |

Group "russian": **2,067** Total volume: **76,570** Average KD: **50%**

Add to keyword list | Update metrics 1/250 | Export

| Keyword | Intent | Volume | KD % | CPC (USD) | Com. | SERP Features | Results | Updated |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| belarus russia | I | 9,900 | 41 | 0.00 | 0.00 | +2 | 805M | Last week |
| is belarus part of russia | I | 8,100 | 71 | 0.00 | 0.00 | | 168M | Last week |
| belarus ukraine russia | I | 2,400 | 44 | 0.00 | 0.01 | | 331M | 2 weeks |
| russia belarus | I | 1,900 | 47 | 0.00 | 0.00 | | 362M | Last week |
| russia ukraine belarus | I | 1,900 | 52 | 0.00 | 0.00 | | 339M | Last week |
| russian ukraine belarus | I | 1,900 | 50 | 0.00 | 0.00 | | 226M | Last week |
| belarus and russia | I | 1,600 | 42 | 0.00 | 0.00 | +2 | 358M | Last week |
| is belarus helping russia | I | 1,600 | 66 | 0.00 | 0.00 | ? +2 | 379M | Last week |
| russia and belarus | I | 1,600 | 49 | 0.00 | 0.00 | | 354M | Last week |
| why is belarus helping russia | I | 1,600 | 65 | 0.00 | 0.00 | ? | 371M | 2 weeks |
| belarus joining russia | I | 1,300 | 43 | 0.00 | 0.00 | | 96.5M | Last week |
| belarus part of russia | I | 1,000 | 69 | 0.00 | 0.00 | | 163M | Last week |
| belarus and russian | I | 880 | 65 | 0.00 | 0.00 | | 419M | Last week |
| belarus russia ukraine | I | 880 | 50 | 0.00 | 0.01 | | 348M | 2 weeks |
| belarus joins russia | I | 720 | 34 | 0.00 | 0.00 | | 3.6M | Last week |
| belarus nuclear weapons russia | I | 720 | 50 | 0.00 | 0.00 | | 4.2M | 2 weeks |
| belarus relationship with russia | I | 720 | 60 | 0.00 | 0.00 | | 33.8M | 3 weeks |

**Таб. 2. Найбольш папулярныя запыты, звязаныя са  словам “Belarus”, на сайце SemRush.**

Разам з запытам “Belarus” часта сустракаецца “russian”, што сведчыць пра моцную сувязь беларускіх тэмаў з Расеяй.

Вынікі з табліц 1 і 2 указваюць на тое, што сярод замежнікаў існуе цікавасць да Беларусі, але яны маюць даволі слабое разуменне, дзе Беларусь знаходзіцца, чый яна хаўруснік і ці з’яўляецца нагоул самастойным палітычным суб’ектам. Пры гэтым колькасць крыніц з інфармацыяй пра Беларусь значна меншая, чым у краін з меншай колькасцю запытаў.

Сярод крыніц на першых пазіцыях пошукавай выдачы, акрамя лакальных крыніц, заўважныя і дзяржаўныя беларускія рэсурсы.

Таксама варта адзначыць, што на запыт “belarus president” амаль усе першыя пазіцыі паказваюць як прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку. Гэта не адлюстроўвае рэчаіснасці ў поўнай меры і можа змыліць карыстальнікаў Google, не раскрываючы ніякай дадатковай інфармацыі пра ўдзел у выбарах 2020-га года Святланы Ціханоўскай.

| | URL | Page AS | Ref. Domains | Backlinks | Search Traffic | URL Keywords |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | https://en.wikipedia.org/wiki/Alexander_Lukashenko<br>wikipedia.org | 62 | 1.2K | 315.0K | 16.2K | 208 |
| 2 | https://president.gov.by/en/president<br>president.gov.by | 24 | 36 | 62 | 1.7K | 49 |
| 3 | https://president.gov.by/en/president/biography<br>president.gov.by | 41 | 77 | 155 | 7.0K | 137 |
| 4 | https://www.britannica.com/biography/Alexander-Lukashenko<br>britannica.com | 49 | 109 | 234 | 5.4K | 113 |
| 5 | https://www.aljazeera.com/news/2023/2/25/belarus-president-lukashenko-to-visit-china-this-month<br>aljazeera.com | 61 | 217 | 7.4K | 444 | 33 |
| 6 | https://www.aljazeera.com/news/2023/2/28/belarus-leader-and-firm-russia-ally-lukashenko-to-visit-china<br>aljazeera.com | 68 | 1.4K | 120.7K | 401 | 88 |
| 7 | https://www.businessinsider.com/who-is-alexander-lukashenko-closer-look-at-the-belarusian-dictator-2021-5<br>businessinsider.com | 40 | 225 | 2.8K | 2.4K | 157 |
| 8 | https://www.belarus.by/en/government/president<br>belarus.by | 23 | 10 | 10 | 291 | 22 |
| 9 | https://apnews.com/article/putin-politics-belarus-government-russia-moscow-47145c0d3da66b04e06abbb5c261c55a<br>apnews.com | 46 | 66 | 881 | 378 | 51 |
| 10 | https://apnews.com/article/belarus-alexander-lukashenko-ap-interview-9bc1f6524eb65841b924883705684b7f<br>apnews.com | 68 | 987 | 2.6K | 203 | 51 |

**Таб. 3. Выдача сайтаў на запыт “belarus president”.**

**Пустая “Вікіпедыя”.** З дапамогай скрыпта “Wikipedia word frequency generator”[2] мы правялі аналіз згадак слоў, якія асацыююцца з Беларуссю і з пералічанымі вышэй краінамі, у англійскамоўнай Вікіпедыі. Па суме згадак першых двух найбольш папулярных слоў (звычайна гэта нацыянальнасць і назва краіны) Беларусь займае 9 месца з 10 з вялікім адставаннем ад папярэдняй Эстоніі.

| Краіна | Першае папулярнае слова | Колькасць згадак першага папулярнага слова | Другое папулярнае слова | Колькасць згадак першага папулярнага слова | Агульная колькасць згадак першага і другога папулярнага словаў | Месца ад 1 (найбольшая колькасць згадак) да 10 (найменшая) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *Беларусь* | *belarus* | *29124* | *belarusian* | *20287* | *49411* | *9* |
| *Чэхія* | czech | 104373 | czechoslovakia | 26897 | 131270 | 5 |
| *Эстонія* | estonia | 37295 | estonian | 33174 | 70469 | 8 |
| *Венгрыя* | hungary | 87340 | austria-hungary | 10792 | 98132 | 6 |
| *Латвія* | latvia | 26873 | latvian | 21420 | 48293 | 10 |
| *Літва* | lithuania | 42305 | lithuanian | 35352 | 77657 | 7 |
| *Польшча* | poland | 230394 | poland's | 6575 | 236969 | 2 |
| *Расея* | russian | 424145 | russia | 273257 | 697402 | 1 |
| *Швецыя* | sweden | 146105 | sweden's | 7602 | 153707 | 3 |
| *Украіна* | ukraine | 126365 | ukraine's | 5471 | 131836 | 4 |

**Таб. 4. Найбольш папулярныя словы, звязаныя з краінамі, і колькасць іх згадак у англійскамоўнай “Вікіпедыі”. Жнівень 2022.**

2 https://github.com/IlyaSemenov/wikipedia-word-frequency/tree/master/results IlyaSemenov “Wikipedia word frequency generator”

**Беларускія студэнты ў міжнародным кантэксце.** Сёння існуюць разнастайныя адукацыйныя магчымасці для беларускіх студэнтаў у замежжы: праграма Кастуся Каліноўскага[3] ў Польшчы, навучанне ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце, кансультацыйная дапамога па паступленні ў Гарвард ад Максіма Багдановіча[4] ці іншых студэнтаў прэстыжных ВНУ. Тым не менш такія магчымасці хаатычныя і адасобленыя адна ад другой, няма ні агульнага разумення колькасці беларускіх студэнтаў у замежных універсітэтах, ні міжуніверсітэцкіх глабальных саюзаў[5], без якіх беларускія студэнты застаюцца адасобленымі альбо гуртуюцца ў маленькія групы без агульнай яскравай плыні, што робіць іх менш бачнымі і заўважнымі ў параўнанні са студэнтамі іншых нацыянальнасцяў.

**Вакуум на лакальным узроўні ўлады.** Праз расейска-ўкраінскую вайну, у якую Лукашэнка ўцягнуў Беларусь, быў парушаны важны ўзровень міждзяржаўнай камунікацыі – паміж мясцовымі ўладамі. Еўрапейскія гарады разрываюць адносіны з беларускімі пабрацімамі[6] [7] [8]. Беларусь сыходзіць з парадку дня ўладаў на найбліжэйшым для людзей узроўні, беларусы супастаўляюцца з рэжымам, скасоўваюцца шматгадовыя культурніцкія і часам эканамічныя сувязі. У выніку застаецца вакуум, не заняты ані рэжымам, ані беларускімі дэмакратычнымі сіламі.

---

3 https://studium.uw.edu.pl/%D1%81%D1%82%D1%8B%D0%BF%D0%B5%D0%BD%D0%B4%D1%8B%D1%8F%D0%BB%D1%8C%D0%BD%D0%B0%D1%8F-%D0%BF%D1%80%D0%B0%D0%B3%D1%80%D0%B0%D0%BC%D0%B0-%D1%9E%D1%80%D0%B0%D0%B4%D0%B0-%D1%80%D1%8D%D1%81%D0%BF%D1%83/ Studium Europy Wschodniej, Стыпендыяльная праграма ўрада Рэспублікі Польшча імя Кастуся Каліноўскага KK – III “Салідарныя з Беларуссю”, 1 кастрычніка 2020.

4 https://www.youtube.com/watch?v=bxyhCJchiKQ , Белсат News, Беларускі студэнт дапамагае паступіць у Гарвард | Беларусский студент помогает поступить в Гарвард, 14 жніўня 2022.

5 https://www.ideasbank.vision/articles/29 , Банк ідэй, “Як павысіць колькасць беларусаў у лепшых універсітэтах свету? Кажа Цімох Акудовіч”, Цімафей Акудовіч, 6 сакавіка 2023.

6 https://ru.hrodna.life/2022/03/03/razryu-adnosinau/ Hrodna.life, “Самый первый город-побратим разорвал отношения с Гродно”, 3 сакавіка 2022.

7 https://www.atviraklaipeda.lt/ru/2022/02/28/%D0%BA%D0%BB%D0%B0%D0%B9%D0%BF%D0%B5%D0%B4%D0%B0-%D1%80%D0%B0%D0%B7%D1%80%D1%8B%D0%B2%D0%B0%D0%B5%D1%82-%D0%BF%D0%BE%D0%B1%D1%80%D0%B0%D1%82%D0%B8%D0%BC%D1%81%D0%BA%D0%B8%D0%B5-%D0%BE%D1%82%D0%BD/ , AtviraKlaipeda.lt, “Клайпеда разрывает побратимские отношения с городами России и Беларуси”,  Денис Кишиневский, 28 лютага 2022.

8 https://brestcity.com/blog/menshe-gorodov-pobratimov, “У Бреста стало меньше городов-побратимов. Александр Рогачук рассказал, почему”, Александр Рогачук, 28 ліпеня 2022.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

На наш погляд, важна працаваць са знешнімі аўдыторыямі, каб зрабіць вобраз Беларусі як еўрапейскай краіны з багатай гісторыяй, цяперашнім і будучым. Замежнікам варта ведаць болей пра Беларусь як пра самастойны палітычны суб'ект, асобны ад Расеі. Самі беларусы могуць успрымацца як людзі, якія прагнуць дэмакратыі і не з'яўляюцца нацыяй з імперскімі амбіцыямі. Грамадства Беларусі павінна адасабляцца ад рэжыму Лукашэнкі.

Улічваючы згаданыя вышэй праблемы і пажаданы вонкавы вобраз Беларусі, мы падрыхтавалі шэраг рэкамендацый:

1. Адным з вырашэнняў праблемы можа стаць стварэнне хаба англійскамоўных беларускіх журналістаў. У яго межах супрацоўнікі медыяў змогуць дзяліцца важнымі для міжнароднай працы кантактамі, распавядаць пра свой вопыт падрыхтоўкі матэрыялаў для заходняй аўдыторыі і адукоўваць маладое пакаленне журналістаў. Важна, каб гэтая пляцоўка ставіла за мэту не навучанне англійскай мове, а менавіта працу з замежнымі медыямі. На базе такога хаба ў будучыні можна будзе сфармаваць англійскамоўнае выданне пра Беларусь. Нам здаецца, што найбольш прафесійным актарам для ажыццяўлення такой задумы з'яўляецца беларускі "Прэс-клуб", які гуртуе вакол сябе вялікае кола адмыслоўцаў.

2. Павысіць узровень ведаў пра Беларусь за мяжой дапаможа таксама арганізацыя марафонаў па напісанні англійскамоўных артыкулаў пра беларускую культуру і гісторыю ў "Вікіпедыі". Гэта павялічыць колькасць згадак пра Беларусь у галоўнай крыніцы інфармацыі ў свеце, а таксама дапаможа прасоўваць беларускі погляд на падзеі, звязаныя з беларускай гісторыяй і грамадскім жыццём. Заняцца арганізацыяй такіх марафонаў маглі б такія ініцыятывы, як Беларуская Рада культуры ці "Движбот", якія маюць, на наш погляд, кампетэнцыі, каб якасна правесці комплекс такіх мерапрыемстваў.

3. Беларускія студэнты таксама могуць паўплываць на сітуацыю з беларускім парадкам дня ў свеце. Мы лічым, што запуск дадатковых праграм мабільнасці для беларускіх студэнтаў павысіць прысутнасць беларускага погляду на падзеі ў свеце, а таксама павялічыць пазнавальнасць беларусаў. Дамоўленасці па такіх праграмах маглі б падпісаць адказныя за адукацыю прадстаўнікі і прадстаўніцы Офіса Святланы Ціханоўскай.

4. На наш погляд, эфектыўна было б увесці новыя падыходы да працы з пабрацімамі беларускіх гарадоў. Напрыклад, у літоўскім горадзе Шаўляй, які раней з'яўляўся пабрацімам беларускага горада Баранавічы, можна было б арганізаваць выставу, прысвечаную сям'і Дар'і і Ігара Лосікаў, палітзняволеных баранавіцкіх актывістаў. Такая і падобныя акцыі павялічылі б пазнавальнасць Беларусі не толькі сярод дзяржаўнага кіраўніцтва, але і на ўзроўні лакальных уладаў замежных краін і дапамаглі б разрыву сувязі "Беларусь=Лукашэнка". Нам падаецца, што гэтым можа заняцца Беларуская Рада культуры, Народныя амбасады Беларусі ці Офіс Святланы Ціханоўскай/Аб'яднаны пераходны кабінет.

5. Яшчэ адным важным складнікам для вырашэння пазначанай праблемы з'яўляецца праца спецыялістаў з піяру і маркетынгу. Важна, каб пошукавыя сістэмы пры запыце аб Беларусі выводзілі на першыя месцы спасылкі незалежных беларускіх медыяў і сайты дэмакратычных сілаў. Больш за тое, важна мець добра распрацаваную камунікацыйную стратэгію, якая б даводзіла ў свядомасць замежнікаў тое, што Беларусь – краіна добрых людзей з дэмакратычнымі каштоўнасцямі і багатай еўрапейскай гісторыяй. Нам падаецца, што Офісу Святланы Ціханоўскай і Аб'яднанаму пераходнаму кабінету варта было б перадаць такую працу іншым, бо гэта складаная функцыя, якая патрабуе спецыфічных ведаў.

# АЎТАРЫ І АЎТАРКІ:



**Аля Рагоцкая**, студэнтка магістарскай праграмы па публічнай палітыцы Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта (Вільнюс, Літва);



**Наста Крывашэева**, журналістка, студэнтка бакалаўрскай праграмы па міжнароднай палітыцы ва Універсітэце Вітаўта Вялікага (Каўнас, Літва);



**Мікіта Чайкоўскі**, сацыёлаг, магістр эканомікі;

**Уладзімір Мазур**, магістр міжнародных эканамічных адносін.

---

Кейс-клуб – гэта каманднае спаборніцтва маладых лідараў і лідарак за лепшы праект па вырашэнні сацыяльнага ці палітычнага выкліку.

Цэнтр новых ідэй – аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Нашая місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

www.newbelarus.vision

Image by www.lonelyplanet.com